# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі. IV клас*

***Берэт.***

*1. Разгадайце рэбус.*

**бе**"  ,

*Запішыце слоўнікавае слова. Выдзеліце ў ім аснову і канчатак. Назавіце апошні гук асновы і ахарактарызуйце яго. Падкрэсліце адпаведную літару.*

*2. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

[е] [я]

б[..]рэт

*3. Падпішыце малюнкі. Абазначце канчатак і аснову ў форме множнага ліку назоўніка.*

 

*4. Спішыце сказ. Устаўце ў словы прапушчаныя літары.*

Маленькі б..рэт — гэта б..рэцік.

*У аднакаранёвых словах вызначыце корань.*

*5. Прачытайце. Дапоўніце радок слоў слоўнікавым словам.*

Бесказырка, кепка, шапка,

Капялюш, ________, фуражка.
Іх абагуліць, канешне,
Нам ніколечкі не цяжка.
*(С. Шах* [1, с. 63]*)*

Бесказырка — шапка без казырка, звычайна ў маракоў.

*Што аб'ядноўвае ўсе словы ў першым сказе?*

*6. Дапоўніце загадку патрэбным словам. Запішыце адгадку.*

Белыя ________,
Залатыя тварыкі. [берэты]
Іх між траў прыкмеціце — [берэцікі]
Ззяюць, як ліхтарыкі.
*(М. Пазнякоў* [2, с. 20]*)*

*Разбярыце па саставе слова, якім дапоўнілі загадку.*

*7. Дапоўніце загадку слоўнікавым словам у патрэбнай форме і адгадайце яе. Закрэсліце ў дужках непатрэбныя літары.*

Я у беленькім ________,
мая **но(ж/ш)ка** не абута.
А як дзьмухне толькі **ве(т/ц)ер** —
ра(с/сс)ыпаю **парашуты**.
*(Н. Галіноўская)*



*Запішыце слова-адгадку. Выдзеліце ў ім канчатак і аснову. Назавіце апошні гук асновы і ахарактарызуйце яго. Падкрэсліце адпаведную літару.*

*У выдзеленых словах абазначце канчатак і аснову.*

***Тэлеграма.***

*1. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| 6 | 2 | 4 | 7 | 3 | 5 | 1 | 9 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| р | э | е | а | л | г | т | а | м |

*Праскланяйце слоўнікавае слова.*

*2. Якія літары «збеглі» са слова? Злучыце іх з месцам пропуску ў слове.*

[е] [і] [я] [э]

т[..]л[..]грама

*3. Запішыце словы, якія «схаваліся» ў слоўнікавым слове* ***тэлеграма****.*

*Вызначыце род запісаных назоўнікаў. Абазначце канчаткі назоўнікаў.*

*4. Прачытайце. Дапоўніце верш слоўнікавым словам.*

Сёння — свята!
Свята ў мамы!
Звоняць ёй,
Шлюць ________.
*(М. Пазнякоў* [3, с. 118]*)*

*Вызначыце род, лік і склон слоўнікавага слова.*

*5. Прачытайце верш. Дапішыце ў слоўнікавыя словы прапушчаныя літары.*

То з гары,
То пад гару
Спрытна скача
Кенгуру —
Хутканогі па..таль..н —
Т..леграмы
Носіць ён.
*(У. Мазго* [4, с. 40]*)*

*Вызначыце склон назоўніка* ***гара*** *ў вершы.*

*6. Гульня «Лесвіца». «Спусціцеся» па лесвіцы і ўпішыце ў пустыя клеткі словы, якія маюць частку* ***тэле-****. Зафарбуйце радок, у які ўпісана слоўнікавае слова.*

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| т | э | л | е | | | н | | | | |
| | | | | с | к | о | п | | | |
| | | | | | | | м | а | | |
| | | | | б | | ч | а | н | н | е |

*Дапоўніце сказы словамі з пірамiды. Змяніце, калі неабходна, формы слоў.*

1) Тата купіў Сяргейку новы ____________. 2) Дзяніс любіць назіраць за зорным небам у ________. 3) Алінка атрымала ____________ з віншаваннем ад бабулі. 4) Мама Іры працуе дыктарам на ____________.

*Вызначыце склон назоўнікаў у сказах.*

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.

13р 98к



***Балерына.***

*1. Злучыце склады так, каб атрымалася слоўнікавае слова.*

[ры] [ле] [ба] [на]

Зафарбуйце ў слоўнікавым слове націскны склад.

*2. Закрэсліце літару, якая сустракаецца часцей за астатнія.*

Б Я А Я Л Я Е Я Р Я Ы Я Н Я А

Запішыце слова, якое атрымалася. Вызначыце род і тып скланення слоўнікавага слова.

*3. Дапішыце прапушчаныя літары ў словы.*

Бале.., бал..рына, б..летны, бале..кі.

*Сярод прапанаваных слоў знайдзіце назоўнікі. Вызначыце іх лік.*

*4. Дапоўніце тэкст патрэбнымі слоўнікавымі словамі. Вызначыце склон назоўніка ў другім сказе.*

У маёй сястры Тані ёсць мара. Яна хоча стаць ____________. Таня ________ наведвае балетную школу. Вочы сястры __________, калі яна ідзе туды на заняткі. Таня старанна выконвае ўсе заданні. Балетмайстар яе хваліць.

Балетмайстар — пастаноўшчык танцаў у балеце.

Словы для даведкі: блішчаць, балерына, ахвотна.

Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы і падкрэсліце іх.

*5. Запоўніце красворд аднакаранёвымі словамі да прапанаванага. Зафарбуйце радок, у які ўпісана слоўнікавае слова.*

| | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | | | | | | б | а | л | е | т | | | | | | | |
| 2 | к | а | р | д | э | | | | | | | | | | | | |
| 3 | | | | | | | | | | | н | ы | | | | | |
| 4 | | | | | | б | | | | | м | | й | с | т | | р |
| 5 | | | | | | | | | | | | н | а | | | | |

*Абвядзіце нумар таго слова, якое з'яўляецца назоўнікам 1-га скланення.*

*У пустым квадраціку побач са значэннем слова пастаўце яго нумар у красвордзе.*

☐ Калектыў балетных артыстаў, які выконвае групавыя танцы.

[1.] Спектакль, змест якога перадаецца танцам і музыкай.

☐ Які мае дачыненне да балета.

☐ Артыстка балета; танцоўшчыца.

☐ Пастаноўшчык танцаў у балеце.

***Плывец.***

*1. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| 3 | 5 | 1 | 6 | 4 | 2 |
|---|---|---|---|---|---|
| ы | е | п | ц | в | л |

*Пастаўце націск у слоўнікавым слове.*

*2. Разгадайце рэбус. Запішыце слоўнікавае слова.*

П  '''  ''ц

*Дапоўніце гэтым словам сказ:*

Чалавек, які плавае, умее плаваць, — гэта ___.

*Знайдзіце ў сказе назоўнікі другога скланення. Вызначыце іх склон, абазначце канчаткі.*

*3. Знайдзіце сярод прапанаваных слоў лішняе і закрэсліце яго.*

Плывец, плоў, плыўчыха, плыве.

*З прапанаваных слоў выберыце тое, якім неабходна дапоўніць верш. Укажыце, якой часцінай мовы з'яўляецца гэта слова.*

**Выдра**



Ля ракі яна жыве,
Спрытна пад вадой _______.
Рыбу ловіць адмыслова,
Нават лепш за рыбалова.

*(Г. Аўласенка* [5, с. 20]*)*

*Падкрэсліце аднародныя члены ў першым сказе.*

*4. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам у патрэбнай форме.*

Ух, і даў удаў нырца!
Уцякайце ад ____________.

*(Н. Сторажава* [6, с. 42]*)*

*Вызначыце склон слоўнікавага слова.*

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Шах, С. М.* Ад імгнення — да стагоддзя : дапам. для лагапедаў агульнаадукац. і спец. шк., дашк. устаноў, настаўнікаў пач. кл. / С. М. Шах. — Мінск : НМЦэнтр, 1998.
2. *Пазнякоў, М. П.* Званочкі велічнай красы : вершы, скорагаворкі, загадкі : для малодшага школьнага ўзросту / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Народная асвета, 2013. — 23 с.
3. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.
4. *Мазго, У. М.* Прыгоды марахода : Казкі. Вершы. Загадкі. Песні. Скорагаворкі. Пацешкі : для мал. шк. узросту / У. М. Мазго. — Мінск : Юнацтва, 2002. — 125 с.
5. Вясёлка. — 2014. — № 4. — С. 20.
6. *Сторажава, Н. А.* Адна сям'я — ад А да Я / Н. А. Сторажава, С. С. Аніскевіч ; маст. У. С. Пашчасцеў, Е. У. Пашчасцева. — 3 выд. — Мінск : Асар, 1995. — 64 с.

**Крыніцы ілюстрацый:** https://i1.i.ua/prikol/pic/3/7/388373.jpg; https://bookz.ru/authors/elena-kaminskaa/vazanie-_480/i_002.png; http://to-draw.ru/images/product_images/popup_images/41_oduvanchik-9.jpg; https://stolowoe-serebro.ru/data/big/xynrg_lp7es.jpg; http://pg-tur.ru/images/stories/vydra-rechnaya.jpg.

***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*

Нацыянальная бібліятэка